# «ІНШАПЛАНЕЦЯНЕ» Ў САКАЛОЎШЧЫНЕ

## РОБАТ ЗАМЯНІЎ НА ФЕРМЕ ДАЯРАК І ВЫВЕЎ ВЫТВОРЧАСЦЬ НА НОВЫ ЎЗРОВЕНЬ

**Мінулай восенню мне патэлефанавалі з Віцебскага аблсельгасхарча і паведамілі, што на ферме «Лаўрукі» СВК «Сакалоўшчына» Верхнядзвінскага раёна «запускаюць» робата, які будзе даіць кароў. Навіна гучала сенсацыйна, бо такога ў Беларусі яшчэ не было.**

Хутка сабраўся ў дарогу. За рулём машыны звычайна лёгка думаецца, пацягнула на ўспамін дзяцінства. Маці мая была даяркай. Уставала а чацвёртай гадзіне раніцы. Калі яна спала – не ведаю. Прачынаўся – яе не было, клаўся спаць – таксама. Яна заўсёды была стомленая і часта скардзілася, што баляць рукі. Была ў нас і свая карова. Аднойчы, каб неяк падмагчы маці, каб не цягнуцца ёй на далёкі выпас у летнюю спёку, я ціхенька наважыўся сам падаіць карову. Рабінка, так яе звалі, нядобразычліва зыркнула на мяне, калі я падставіў вядро пад вымя, і – малака не аддала. Усяго некалькі белых кропелек забрынчэла на дне вядра. Хоць трохі мяне ўсцешыла тое, што Рабінку наогул мала каму з вёскі ўдавалася падаіць – наравістая была жывёліна. Дык няўжо робат, гэтая бездухоўная машына, зможа справіцца лепш, чым чалавек?

Малочнатаварная ферма «Лаўрукі«



Перш чым трапіць на ферму, якая знаходзілася за некалькі дзесяткаў кіламетраў ад райцэнтра, давялося здорава папятляць па розных дарогах, асфальтавых і грунтавых. А калі пабачыў далёка не новую жывёлагадоўчую пабудову, то і ўвогуле падумаў: ці туды прыехаў? Аднак сумненні развеялі калегі-журналісты, якія паведамілі, што вось-вось павінны з'явіцца высокія госці. І яны не прымусілі сябе доўга чакаць.

Першымі крочылі тагачасны губернатар Віцебскай вобласці Уладзімір Андрэйчанка і намеснік старшыні аблвыканкама Іосіф Палачанін. Дарэчы, абодва яны ў розны час былі кіраўнікамі Верхнядзвінскага раёна.

Перш чым прапанаваць зайсці ўнутр фермы, усім прысутным выдалі халаты, шапачкі і нешта накшталт чахлоў на абутак. Памяшканне, дзе знаходзіліся каровы, аказалася надзіва прасторным. Пасярэдзіне яно было раздзелена бар'ерам, за якім і знаходзіліся робаты. Абсалютна нічога грувасткага – сістэма нагадвала элегантнае плячо, пафарбаванае ў чырвоны колер.

І, нарэшце, хвалюючы момант. У спецыяльны бокс карова заходзіць сама. Імгненна аднекуль выпаўзаюць мяккія шчоткі і абмываюць цёплай вадой вымя. Аднак для мяне заставалася загадкай, як жа робат падключыць даільныя стаканчыкі да саскоў каровы? Не кожнаму апаратару машыннага даення гэта аперацыя ўдаецца з першага разу. Але раптам блісНуў нейкі праменьчык, і стаканчыкі, быццам хто накіроўваў іх упэўненай рукой, знайшлі саскі каровы, прынялі іх, і – пайшло малако. Усяго тры хвіліны – карова выдаена, яе месца займае другая.

Неверагодна!..

Аднак і гэта яшчэ не ўсё. Неўзабаве высветлілася, што робат не толькі доіць кароў, але выдае поўную інфармацыю аб іх здароўі і нават лечыць.

Сапраўды, казка. А стварылі гэту казку супрацоўнікі кампаніі «Біякам Тэхналогія». Галоўныя героі падзеі, як гэта нярэдка бывае, у агульным натоўпе ўдзельнікаў урачыстасці «згубіліся». Яны стаялі ўбаку і стараліся не «лезці на вочы». Хлопцаў можна было зразумець – яны сваю справу зрабілі.

– Мы ўстанавілі высокатэхналагічнае абсталяванне для даення, – патлумачыў кіраўнік фірмы Андрэй Паўлоўскі. – У прыватнасці, гэта робат трэцяга пакалення «Астранаўт-3» адной галандскай фірмы. З 7 тысяч аналагічных робатаў, якія выкарыстоўваюцца цяпер у свеце, 6 тысяч – вытворчасці гэтай галандскай кампаніі. Нашы спецыялісты праходзілі

трох-шасцімесячнае навучанне ў Галандыі і Германіі. Што датычыцца самога робата – гэта будучае жывёлагадоўлі. Створаны механізм, які не залежыць ад так званага чалавечага фактара і дазваляе поўнасцю раскрыць генетычны патэнцыял жывёлы. Калі цяпер карова дае 15–20 літраў малака, то зможа 30–35 літраў. Прычым малако толькі экстра-класа, якое звычайна ідзе на асобную перапрацоўку для дзіцячага харчавання. Дарэчы, укладанні ў набыццё робата вернуцца дзесьці гады за тры.

## У «ЛАЎРУКІ» ЯК У ЛУЎР

Але вакол цікавай справы хапала і скептыкаў. Бываючы ў камандзіроўках, часта чуў пытанні: «Ну, як там робат? Не паламаўся яшчэ? Ці ёсць ад яго хоць якая аддача?» ці такія сцвярджэнні: «Купілі дарагую цацку. Не было куды грошай дзяваць...».

Каб даць абгрунтаваны адказ, давялося зноўку, трохі больш як праз паўгода, наведаць СВК «Сакалоўшчына».

«Робат укалвае за пяцярых!» – задаволена адзначыў старшыня сельгаскааператыва Уладзімір Корсун. І растлумачыў: раней на ферме былі чатыры асноўныя даяркі і адна падменная – цяпер спраўляецца адзін робат. На ферме засталіся аператары камп'ютарнага кіравання – асноўны і падменны, ды два вартаўнікі: дзённы і начны. Наогул, персанал фермы скараціўся ўдвая.

І вось мы на ферме «Лаўрукі». Здаецца спачатку, што ўсё тут, як на звычайнай. Аднак спакваля разумееш: нешта не так. Ага, гэта ж якраз час абедзеннай дойкі. Малако цячэ па трубах, а ў памяшканні – ніводнага чалавека.

– А дзе ж аператар? – вырываецца міжволі ў мяне.

– Напэўна, ля камп'ютара, – зрабіў здагадку старшыня і не памыліўся. Юрый Садоўскі, хлопец магутнага целаскладу, уважліва вывучаў нейкія табліцы на экране манітора. Аказваецца, яшчэ зусім нядаўна ён быў галоўным ветурачом гаспадаркі. Абставіны прымусілі змяніць прафесію. Хоць слова «змяніць» гучыць не зусім дакладна. Хутчэй – набыць яшчэ адну, бо ён, фактычна, ветурачом і застаўся. Камп'ютар выдае ўсю інфармацыю пра кожную карову: пра стан яе здароўя, прадукцыйнасць і гэтак далей. Усё гэта трэба прааналізаваць і, пры неабходнасці, унесці карэктывы ў рацыён ці выпрацаваць схему лячэння. А хто можа гэта лепш зрабіць, калі не спецыяліст?

Напарнік у Юрыя, або, як гавораць, «падменны» – Сяргей Смірноў, былы механізатар. Адна з даярак фермы, Леаніда Дарожка, цяпер працуе тут прыбіральшчыцай. Яна не хавае свайго захаплення робатам: «Я абслугоўвала пяцьдзесят кароў. Тры дойкі. За дзень так наробішся, што не адчуваеш ні рук, ні ног. А тут з усім спраўляецца робат. Ну прама як у казцы!»

Аднак не толькі ў працы дала палёгку сучасная тэхніка. Дзякуючы робату захоўваецца элітны статак. Ні для кога са спецыялістаў не сакрэт, што самыя лепшыя высокапрадукцыйныя каровы часта выбракоўваюцца




Аператар Таццяна Майсеева разумее «мову» робатаў

з-за мастыту. Цяпер на гэтым пастаўлена кропка. Робат, па-першае, робіць масаж вымя каровы. Па-другое, пры самым нязначным падазрэнні на мастыт не толькі пасылае сігнал аб гэтым на камп'ютар, але нават і лечыць карову!

Разумная машына сама і адсартоўвае малако: надой ад хворай каровы ніколі не трапіць у агульны «кацёл». У выніку 97 % малочнай сыравіны з фермы «Лаўрукі» здаецца на перапрацоўчае прадпрыемства сортам экстра-клас. Што гэта значыць? А тое, што тона адпаведнага прадукту даражэйшая за тону малака першага гатунку на 270 тысяч рублёў, вышэйшага –



Старшыня
СВК «Сакалоўшчына»
Уладзімір Корсун

на 210 тысяч. Толькі на гэтым дадаткова атрымліваецца выручкі больш як 100 мільёнаў рублёў.

Але і гэта яшчэ не ўсе перавагі робата. Чамусьці існавала думка, што робат «пацягне» шмат электраэнергіі. Выйшла ж наадварот. За месяц ён узяў усяго 3700 кВт, у той час калі побач, на такой жа ферме з такой жа колькасцю дойнага статка, зрасходавана 8200 кВт.

Яшчэ адзін важны момант. Правільнай тэхналогіі даення кароў «вучыліся» ў робата... усе аператары гаспадаркі! І як бы там ні было, сёння надой ад каровы ў СВК «Сакалоўшчына» – 20 літраў у суткі. Плюс да мінулагодняга выніку за аналагічны перыяд складае 3 літры. І малака сельскагаспадарчы кааператыў прадае цяпер больш за ўсіх у раёне. Штодзённая выручка ад рэалізацыі малочнай сыравіны перапрацоўшчыкам складае 15 мільёнаў рублёў.

Усё гэта добра, скажаце, але вось зламаецца робат, паскачы тады!

– За восем месяцаў надарылася толькі адна непаладка, – заўважыў кіраўнік гаспадаркі. – Пазванілі позна вечарам на фірму, якая паставіла і змантіравала абсталяванне. Раніцай спецыялісты былі ў нас і хутка ўхілілі непаладкі. На ўсялякі, як кажуць, «пажарны» выпадак мы трымаем каля фермы перасоўную дойку, але ні разу так ёй і не карысталіся.

Цяпер самым вузкім месцам у жывёлагадоўлі СВК Уладзімір Корсун лічыць папаўненне дойнага статка. Але тут ёсць праблема: карове, перш чым яна трапіць у залу да робатаў, абразаюць рогі. Ды і прывыканне да апарата для жывёлы – стрэс. Ці можна яго пазбегнуць?

– Бясспрэчна, – лічыць старшыня, – калі пра дойны статак задумацца з нараджэння цяляці!..

Не адкладваючы справы далёка, кіраўнік сельгаскааператыва заняўся ўзвядзеннем тэнтавага арачніка на 600 галоў маладняку, дзе цялят будуць выпойваць... аўтамамы, гэта значыць – таксама робаты. З першых крокаў жыцця цялё будзе да іх прывыкаць, як да чалавека. Значыць, у далейшым – ніякіх стрэсаў.

Робаты ў СВК «Сакалоўшчына» ўздымаюць на новую вышыню не толькі жывёлагадоўлю, але і паляводства. Больш нарыхтавана кармоў, больш намалочана збожжа. Ідзе ўмацаванне кадравага корпуса. Галоўным аграномам прызначана Анжаліка Кузьмінова, вельмі дасведчаны спецыяліст і адказны работнік. Прыехала яна ў гаспадарку ажно з Мінскай вобласці.

– Прачытала ў Інтэрнэце пра робатаў і падумала: «Калі там робаты працуюць, то гаспадарка павінна быць нядрэнная!»

Так пракаменціравала жанчына свой пераезд у глыбінку Віцебскай вобласці.

Далей – болей. У СВК «Сакалоўшчына» не планаваўся аграгарадок. Цяпер ён будуецца. Узводзяцца прыгажуны-катэджы. Апранаюцца ў асфальт дарогі.

– Іначай нельга,– даводзіць Уладзімір Корсун. – Да нас ледзь не кожны тыдзень едуць паглядзець на робатаў дэлегацыі з усёй рэспублікі. Трэба ж і выгляд мець адпаведны!

– А як увогуле прыйшла вам у галаву ідэя ўстанавіць на ферме робатаў? Да гэтага не «дайшлі» нават у такіх вядомых і супербагатых гаспадарках краіны, як агракамбінат «Сноў», СВК «Прагрэс-Верцялішкі» і іншых.

– О, гэта асобная гісторыя! – ажывіўся старшыня. – Пачалося ўсё з таго, что дэлегацыя з нашага раёна паехала ў Эстонію. У ёй быў і начальнік упраўлення сельскай гаспадаркі райвыканкама Уладзімір Яраховіч. Вось там ён і нагледзеў тых робатаў. Прыкаціў у «Сакалоўшчыну» і гаворыць: «Слухай, Уладзіміравіч, давай мы табе робатаў паставім!» А ў мяне ж – 21 ферма. Большасць дробныя, у сямі месцах знаходзяцца. Я хацеў жывёлагадоўчае памяшканне будаваць на тысячу кароў з даільнай залай, каб неяк сабраць жывёлу ў цэнтр. Расказваю яму пра свае планы, а ён мне зноў пра робатаў даводзіць. Ну і не змог я адмовіцца.

Самае ж цікавае наперадзе. Пачалі мы шукаць памяшканне пад тую навінку. Спыніліся на ферме «Лаўрукі». Усё быц-

цам нармальна. Адно толькі засмучала: куды быкоў з яе падзець? Як-ніяк, а на двары – кастрычнік. Знайшоў выйсце: перавёў быкоў у шохі. Другое, больш складанае было – да новага года рэканструяваць памяшканне фермы. Такая была ўмова, каб устанавіць абсталяванне з робатамі. Узяўся і за гэта. Падумаў, што калі пачнём будаваць, то нечым жа дапамогуць раённыя ўлады. Мо хоць дарогу да фермы людскую пракладу?!

Неаднназначна ўспрынялі мае дзеянні і людзі. Калі выгнаў быкоў з памяшкання ў шохі на зіму гледзячы, то яўна не адобрылі майго рашэння. Маўляў, старшыня нешта не тое робіць. А калі я заявіў на сходзе, што на ферме робаты будуць даіць кароў замест даярак, то ў зале падняўся рогат: «Як гэта без даяркі карову падаіць?!» На мяне пачалі глядзець надта падазрона.

Скончылася ж тым, пра што вы ўжо ведаеце. Робата запусцілі без праблем. І трэба было бачыць твары тых, хто зімою рагатаў, не паверыўшы ў поспех фантастычнай задумы.

Яны глядзелі на ўсё, як заварожаныя. На тых, хто калі-нікалі заглядваў у чарку, нават утрапенне нейкае найшло. А потым вокліч: «Людзі, ратуйцеся! Іншапланецяне!» Калі дакумекалі, што да чаго, зразумелі – ратавацца цяпер сапраўды трэба. Будзеш прагульваць – старшыня паставіць робата. А ты – дзявайся куды хочаш тады! «Не-е, трэба хутчэй кідаць шкодныя звычкі!» – зрабілі адназначны вывад. Такі вось нечаканы эфект рабатызацыі. Асабліва прыязна ўспрыняла з'яўленне механічных памочнікаў у гаспадарцы моладзь. А як жа? Абслугоўваць робатаў і цікава, і прэстыжна!

І чаго ехаць у свет, калі дома такія цуды творацца!

Аповед пра новую справу быў бы няпоўны, калі б мы не расказалі хоць крыху пра фірму, якая ўстанавіла робаты ў СВК «Сакалоўшчына» і дзякуючы якой здзяйсняецца, не будзем саромецца гэтага гучнага слова, рэвалюцыя ў жывёлагадоўлі. Дык вось, кампаніі «Біякам» у гэтым годзе спаўняецца 17 гадоў. Заснаваў яе Андрэй Паўлоўскі, які і зараз стаіць ля штурвала вытворчага карабля. Калектыў пачынаў з аптовых паставак у краіну ветэрынарных прэпаратаў замежнай вытворчасці. Тры гады таму быў узяты курс на вытворчасць імпартазамяшчальнай прадукцыі. У выніку рэалізаваны ўнікальны нават па маштабах СНД праект: у СЭЗ «Гроднаінвест» быў запушчаны завод «Біякам» па вырабе замяняльнікаў малака і кармавых дабавак для жывёлы і птушкі. У аснове вытворчасці – найноўшая тэхналогія, якая дае магчымасць вырашаць цэлы комплекс задач і выпускаць унікальныя прадукты на аснове мясцовай сыравіны. У час вырабу, у прыватнасці, можна змешваць да 140 кампанентаў, атрымліваць прадукт аднароднасці да 99,8 %, можна з высокім узроўнем дакладнасці ўводзіць вадкія і сыпучыя кампаненты. Наяўнасць сертыфіката менеджмента якасці ISO 9001-2001 гарантуе надзейнасць ТАА «Біякам» як дзелавога партнёра.



Новае жыллё для працаўнікоў гаспадаркі

На сённяшні дзень кампанія ажыццяўляе прамыя пастаўкі прадукцыі больш як на 600 прадпрыемстваў краіны. Сярод іх – буйныя свінагадоўчыя і жывёлагадоўчыя комплексы, птушкафабрыкі, камбінаты хлебапрадуктаў.

Два гады таму была створана даччыная кампанія «Біякам Тэхналогія», якая і занялася робатамі. Першай «ластаўкай» было іх з'яўленне ў СВК «Сакалоўшчына» Верхнядзвінскага раёна. А нядаўна стала вядома, што ў гэтай гаспадарцы ўзводзіцца новая ферма, на якой даіць кароў будуць таксама толькі робаты. Ажно 6 штук!

**Уладзімір САУЛІЧ** ■